# НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ МУЗЕЯЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

**С. М. Гаўрылава,**
*намеснік начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь*

За апошнія дзесяцігоддзі істотна змяніўся статычны і кансерватыўны музейны свет. Сёння музей з'яўляецца базавай установай, якая мае магчымасць захаваць памяць аб мінулым і культурную спадчыну. Гэта накладвае на музеі вялікую адказнасць, у тым ліку і за распараджэнне нацыянальнай спадчынай. Рубеж XX і XXI стст. вызначаны пошукам новай мадэлі музея, якая адпавядае змяніўшымся ўмовам грамадскага жыцця. Музеі як неад'емная частка ўвашлі ў сістэму арганізацыйных, фінансавых, інфармацыйных і іншых дзяржаўных мер, накіраваных на захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. Акрамя гэтага, ахоўная функцыя музеяў знайшла сваё адлюстраванне не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце.

У апошнія гады актыўна ідзе працэс фарміравання асноў новага заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Былі прыняты важнейшыя заканадаўчыя акты, як накіраваны на стварэнне прававой базы для захавання і развіцця айчыннай культуры.

Асноўным дакументам, які рэгулюе дзейнасць музеяў, з'яўляецца Закон Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (далей – Закон), прыняты 12 снежня 2005 г. Упершыню Законам было замацавана, што дзяржаўную палітыку ў сферы музейнай справы ажыццяўляе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Вызначаны галоўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў музейнай справе: забеспячэнне агульнадаступнасці музейных прадметаў і музейных калекцый; падтрымка дзяржаўных праграм развіцця музейнай справы, забеспячэнне захаванасці Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь; падтрымка навуковых даследаванняў у музейнай справе.

Закон уключае таксама спектр пытанняў па дзяржаўным рэгуляванні музейнай сферы, парадку стварэння і ліквідацыі музеяў, вызначэнні права ўласнасці на музейныя прадметы і калекцыі, што ўваходзяць у склад Музейнага фонду, асаблівасцях выкарыстання і захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый, распараджэння імі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Упершыню заканадаўча замацоўваецца, што музейныя прадметы і калекцыі, уключаныя ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца неад'емнай часткай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Але пры прымяненні той ці іншай нормы быў адзначаны шэраг пытанняў, якія патрабавалі неадкладнага вырашэння. Таму, зыходзячы з практыкі выкарыстання гэтага Закона, было прынята рашэнне аб унясенні ў яго змяненняў і дапаўненняў.

Зыходным пунктам распрацоўкі новага законапраекта можна лічыць выязное пасяджэнне камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, якое адбылося на базе Нацыянальнага мастацкага музея 19 студзеня 2009 г. Менавіта там былі агучаны пытанні, якія падлягалі заканадаўчаму ўрэгуляванню. Па выніках пасяджэння праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь"» быў уключаны ў адпаведны План падрыхтоўкі законапраектаў на 2010 г., зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 2.

Загадам Міністра культуры была створана рабочая група па распрацоўцы законапраекта, якая складалася – з 30 чалавек– спецыялістаў упраўленняў культуры, адказных за гэты кірунак працы, дырэктараў абласных, рэспубліканскіх музеяў. На працягу двух гадоў адбылося шэсць пасяджэнняў рабочых груп, тры пашыраныя і тры выязныя пасяджэнні камісіі, у тым ліку адно сумеснае з Пастаяннай камісіяй Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. Па законапраекце паступіла больш як 50 прапаноў, большасць з іх былі ўлічаны пры дапрацоўцы праекта.

Закон «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь"» быў падпісаны Кіраўніком дзяржавы А. Р. Лукашэнкам 3 ліпеня 2011 г.

Большую частку дакумента займаюць прапановы па ўдасканаленні дзеючага Закона – у тым ліку і чыста тэрміналагічнага характару. Аднак ёсць і шмат новых артыкулаў.

Асобны артыкул уведзены ў мэтах прывядзення Закона ў адпаведнасць з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 кастрычніка 2009 г. № 510 «О совершенствовании контрольной (надзорной) деятельности в Республике Беларусь». Калі раней

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кампетэнцыяй Міністэрства культуры была замацавана норма ажыццяўлення кантролю за станам захаванасці Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь, то вышэйзгаданым Указам паўнамоцтвы Міністэрства культуры пашыраны. Прадугледжаны кантроль за выкананнем заканадаўства ў музейнай сферы.

Законам удакладнены тэрміналогія і парадак рэгулявання асобных пытанняў музейнай справы. Слова «музей» гучыць вельмі часта і ўжываецца не заўсёды дакладна. Адпаведна, неабходна было ўдакладніць гэты тэрмін у юрыдычным вымярэнні. Паводле дзеючага заканадаўства музеем мае права лічыцца тая ўстанова, якая рэалізуе большасць відаў музейнай дзейнасці (7 з 12). Але ў сучасным варыянце вызначаны найпрыярытэтныя шэсць відаў дзейнасці. Перадусім унесены змяненні *ў вызначэнне тэрміна «музей»,* што дазволіла больш дакладна акрэсліць віды музейнай дзейнасці, якія з'уляюцца абавязковымі для кожнага музея. Гэта – выяўленне прадметаў музейнага значэння, *камплектаванне* музейных фондаў, *улік, захаванне, вывучэнне і папулярызацыя* музейных прадметаў і музейных калекцый. Змяненні ўнесены і ў шэраг іншых тэрмінаў: прадмет музейнага значэння, музейная справа, музейная калекцыя, музейны работнік. Гэта дазволіла не толькі ўпарадкаваць музейную сетку краіны, але і з большай адказнасцю адносіцца да стварэння новых музеяў, а таксама прывесці музеі любой формы падпарадкавання ў адпаведнасць з дадзеным Законам.

У якасці аднаго з асноўных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы музейнай справы названа, акрамя *забеспячэння захаванасці* Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь, *забеспячэнне спецыяльных рэжымаў захоўвання* музейных фондаў.

Законам вызначаны новы змест артыкулаў аб *міжнародных сувязях.* Упершыню прадугледжана прадастаўленне гарантый захаванасці і своечасовага вяртання культурных каштоўнасцей, якія будуць увозіцца ў краіну для арганізацыі выставак. Паколькі заканадаўства Рэспублікі Беларусь не прадугледжвала такой магчымасці, арганізацыя выбітных міжнародных выставак зрывалася. У свеце інтэграцыйных працэсаў, пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва заканадаўча замацоўваецца магчымасць прадастаўляць гарантыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пры арганізацыі выставак з фондаў замежных музеяў. Афіцыйныя гарантыі Міністэрства культуры краіны могуць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'явіцца грунтам для шэрагу важных міжнародных выставачных працтаў.

Сёння ў краіне дзейнічаюць 153 музеі сістэмы Міністэрства культуры, 1479 музеяў сістэмы Міністэрства адукацыі, каля 200 музеяў іншых ведамстваў, 7 прыватных і 14 – створаных грамадскімі арганізацыямі. Але дакладнага рэестра музеяў у краіне няма, і ўпаўнаважаная арганізацыя па вядзенні такога пераліку не вызначана. Таму ёсць неабходнасць урэгуляваць гэтае пытанне на заканадаўчым узроўні.

Ужо больш за 10 гадоў у краіне дзейнічае Рэспубліканская рада дырэктараў музеяў. Гэты орган распрацоўвае рэкамендацыі па ўдасканаленні працы музеяў, аказвае ім метадычную дапамогу, каардынуе міжмузейнае супрацоўніцтва, у тым ліку міжнароднае. Законам вызначаны статус і кампетэнцыя рады.

У краіне дзейнічаюць 23% музеяў гістарычнага і этнаграфічнага профіляў. У адпаведнасці з Канвенцыяй аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, ратыфікаванай Рэспублікай Беларусь у 2004 г., музеі, як і іншыя ўстановы культуры, займаюцца выяўленнем, камплектаваннем, вывучэннем, захаваннем і папулярызацыяй аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Таму неабходна было зафіксаваць адпаведныя змяненні ў Законе.

Дзеючым Законам вызначаны асаблівасці прававога становішча і парадку дзейнасці гісторыка-культурных музеяў-запаведнікаў. Паколькі музеі пад адкрытым небам маюць спецыфіку ў параўнанні з музеямі-запаведнікамі, то і разглядаюцца ў асобным артыкуле Закона. Спецыфікай такіх музеяў з'яўляецца тое, што яны экспануюць многія са сваіх музейных прадметаў пад адкрытым небам, адпаведна і абараніць такія прадметы ад выкарыстання ва ўмовах, якія ствараюць пагрозу іх захаванню і (або) могуць прывесці да іх пашкоджання, страты ці знішчэння, немагчыма.

Устанаўленне памеру платы за наведванне экспазіцый і выставак, за выдачу дазволу без абгрунтавання эканамічных выдаткаў па ўзгадненні з заснавальнікам абумоўлена тым, што тарыфы на гэтыя віды адсутнічаюць, а значыць, не могуць рэгулявацца Указам Прэзідэнта ад 19 мая 1999 г. № 285 «Аб некаторых мерах па стабілізацыі цэн (тарыфаў) у Рэспубліцы Беларусь».

Тая ж сітуацыя і з аплатай за выдачу дазволу на выкарыстанне выяў музейных прадметаў і музейных калекцый, будынкаў музеяў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'ектаў, размешчаных на тэрыторыі музеяў. З гэтай нагоды новыя нормы ўведзены ў Закон.

Удакладненні ўнесены ў дачыненні да тэрмінаў «музейны прадмет» і «музейная калекцыя», паколькі адзінкай уліку з'яўляецца музейны прадмет, а не музейная калекцыя.

Практыка выкарыстання Закона паказала, што ў ім улічаны не ўсе выпадкі, якія могуць быць падставай для выключэння музейных прадметаў з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Так, у выпадку крадзяжу музейнага прадмета, які пацвярджаецца адпаведнымі дзяржаўнымі органамі, не ўлічваюцца сітуацыі, калі з заканчэннем тэрміну даўнасці крымінальная ці адміністрацыйная справа не ўзбуджаецца. У музеях зафіксаваны таксама выпадкі, калі па рашэнні суда музейныя прадметы былі вернуты іх законным уладальнікам. У гэтай сувязі лічым неабходным дапоўніць нормы аб выключэнні музейных прадметаў з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з дзеючым Законам усе музейныя прадметы падлягаюць цэнтралізаванаму ўліку шляхам вядзення Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Аднак аналіз музейных фондаў краіны паказаў, што больш за палову музейных прадметаў – гэта археалагічны матэрыял (у пераважнай большасці керамічныя фрагменты сценак, венчыкаў і донцаў пасудзін), малакаштоўныя прадметы (падшыўкі газет, ксеракопіі дакументаў і інш.). Лічым, што ўключаць звесткі аб іх у Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь немэтазгодна, паколькі інфармацыя аб кожным музейным прадмеце павінна быць прадстаўлена ў Дзяржаўным каталогу Музейнага фонду па 20-і пазіцыях і на 3-х мовах, што патрабуе вялікіх часавых і фінансавых затрат. Пры гэтым вопыт Расійскай Федэрацыі паказаў, што за 14 гадоў апрацавана толькі 13% інфармацыі аб музейных прадметах, а да моманту збору канчатковай інфармацыі доступ да яе закрыты.

У сувязі з вышэйадзначаным, пытанні ўліку музейных прадметаў (як унутрымузейнага ўліку, так і цэнтралізаванага) ўрэгуляваны комплексна. Спадзяёмся, што гэта дазволіць у кароткі тэрмін завяршыць работу па стварэнні Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь і ўвесці ў навуковы абыходак сапраўды найкаштоўнейшыя музейныя прадметы.

Пытанні ўліку музейных прадметаў, а таксама фарміравання Дзяржаўнага каталога асабліва каштоўных музейных прадметаў перш за ўсё стаялі перад музеямі, якія дзейнічаюць не ў сістэме

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства культуры, а іншых міністэрстваў і ведамстваў. Для правядзення працэдуры ўліку па спрошчанай схеме было прынята кампрамісное рашэнне аб увядзенні асобных глаў у інструкцыі, якія рэгулююць парадак уліку музейных прадметаў.

Увядзенне ў дзеянне адзначанага Закона з'яўляецца прагрэсіўным крокам для функцыянавання музеяў нашай краіны, паспрыяе далейшаму развіццю нацыянальнай музейнай справы і ўключэнню яе ў сусветны культурны працэс; дазволіць увесці ў дзеянне Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь, будзе садзейнічаць ідэнтыфікацыі і папулярызацыі беларускай гісторыка-культурнай спадчыны; дасць магчымасць прывесці музейную тэрміналогію ў адпаведнасць з агульнапрынятымі нормамі сусветнага музеязнаўства; дазволіць музею самастойна планаваць атрыманне даходаў з дадатковых крыніц фінансавання; упарадкуе Музейны фонд Рэспублікі Беларусь; якасна палепшыць усе віды дзейнасці музеяў Рспублікі Беларусь і іх матэрыяльна-тэхнічную базу.

Міністэрствам культуры падрыхтаваны шэраг новых нарматыўных актаў, прыведзены ў адпаведнасць з Законам дзеючыя нарматыўныя дакументы.

Былі ўнесены змяненні ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых пытаннях перамяшчэння музейных прадметаў і (альбо) музейных калекцый праз мяжу Рэспублікі Беларусь» ад 10 ліпеня 2006 г., зацверджаныя пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Палажэнне аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь ад 10 чэрвеня 2006 г., Палажэнне аб парадку работы наведвальнікаў музеяў з музейнымі прадметамі і (або) музейнымі калекцыямі ад 3 жніўня 2006 г., пастановамі Міністэрства культуры Інструкцыю аб парадку стварэння і адкрыцця экспазіцый і выстаў музеяў (2006), Інструкцыю аб парадку камплектавання музейных фондаў, унутрымузейнага ўліку, навуковай апрацоўкі і захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў» (2007), пастанову Міністэрства культуры «Аб устанаўленні пераліку відаў культурных каштоўнасцей, якія вызваляюцца ад падатку на дабаўлены кошт пры іх увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, а таксама пры рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» (2011). Страціла сілу Палажэнне аб музеі навучальна-выхаваўчай установы, зацверджанае загадам Міністэрства адукацыі (1999).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Былі прыняты новыя дакументы: Палажэнне аб асаблівасцях прававога становішча музея пад адкрытым небам, яго аховы і выкарыстання, зацверджанае пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 кастрычніка 2011 г., Палажэнне аб рэестры музеяў, зацверджанае пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 23 верасня 2011 г. Загадам Міністра культуры № 149 ад 30 верасня 2011 г. зацверджаны склад Рэспубліканскай рады дырэктараў, палажэнне аб яе дзейнасці.

Гэтыя дакументы юрыдычна аформілі і замацавалі асноўныя рэгламентуючыя нормы музейнай дзейнасці ў краіне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ